«Моя Родина – Беларусь»
Покатова Ёлла

ГУО «Клястицкая средняя школа имени В.А.Хомченовского Россонского района»

6 класс

## Мая Радзіма - Беларусь

І там бабулька ў кошык свой
Той клёкат з долу сабірае
І на здзіўлены вокліч твой
“Дзяндобры” – вымавіць старая.
Л. Дранько-Майсюк

Аўтобус мякка перабірае коламі бездакорна гладкую дарогу, нават можна прыхінуць галаву да шыбы і падрамаць. Ой, дзяўчаткі, глядзіце! – шчырае захапленне ў голасе маёй сяброўкі прыпыняе мой адпачынак. Мы пераехалі мяжу Глыбоцкага раёна. Акуратныя падворкі з вялікімі садамі і шматфарбнымі палісаднікамі прыцягваюць позіркі: ні кавалка недагледжанай зямлі, чыста і так утульна. Аздобленыя дворыкі мудрагелістымі ўзорамі веснічкі і налічнікі на вокнах, выразаныя з дрэва фігуркі казачных персанажаў нібы гавораць: не тое яшчэ наперадзе вас чакае.

“На Беларусі ёсць яшчэ шмат куткоў, не горшых ад заморскіх”- прыйшлі радкі Янкі Маўра з “Палескіх рабінзонаў”. Не палескія пушчы, праўда, наперадзе, а Беларускі Версаль. Так называюць вёску Мосара ў Глыбоцкім раёне. Пра гэту вёску я чула шмат чаго дзіўнага ад сваёй сяброўкі, у якой там жыве бабуля. Таму на экскурсію з радасцю згадзілася. Дагледжаныя палі, у летняй зеляніне ўзгоркі, кусты ракіт з русымі веерамі, усцяж дарогі абганяюць беластволыя па-дзявоцку цнатлівыя бярозы. Далікатныя буслы паважна ходзяць па палях і ўдзячным клёкатам вітаюць пачатак новага дня. Такая першародная чысціня напаўняе душу, што здаецца яшчэ хвіліна і ты ў раі. Так і ёсць, пад’язджаем. Нешта неверагоднае. Такое я бачыла па тэлебачанні. Убачанае апісаць не хопіць ніякіх выразаў і фарбаў. Толькі сэрца, якое ад захаплення, здавалася, вырвецца з грудзей, магло б паказаць на кардыяграме мяжу майго ўраджання. Я ведала, што мясціны казачныя, бо людзі тут таксама незвычайныя. Яны змаглі захаваць мінулае, узбагаціць сучаснае і зазірнуць у будучае. З Юлінай бабуляй мы дамовіліся сустрэцца каля касцёла. Яна маленькая, зграбная і рухавая з’явілася з-за касцёльнай брамы. “Дзяньдобры, дзяўчаткі, – нязвыкла павіталася бабулька, - Сукенкі пекныя, фальбоны ды карункі, а хустачкі дзе ж? Спякотна. Ды і ў касцёл ідзяце.”

Юля цалавала бабульку і радавалася яе рухавасці і добраму здароўю. Я – як жа святы Божа дае. Што нядзелька ў касцёле, што свята ўсё тут. Адсюль іду, крылы вырастаюць. Адчуваю шчасце і прагу дзяліцца ім. Любоў да пана Бога ад бабулі сваёй маю. Касцёл і пры савецкай уладзе, на шчасце, дзейнічаў. Таму людзі тут усе з Богам у сэрцы жывуць па Божых законах. І знешне прыгожыя і душой прыхільныя. Такія ж і краявіды з лёгкай рукі Госпада. За сузіраннем

велічы старажытнага касцёла, лікаў святых і анёлаў, рассыпаных шчодраю рукой кветак і зеляніны, напоеная святой вадой, незаўважна ішоў час. Мы падышлі да хаты, якая здавалася працягам Версальскіх шэдэўраў. Трохвяковая бяроза прыбраная каляровымі стужкамі сустрэла нас ля веснічак пяшчотнымі дотыкамі рук-галінак. Гэта маё трыадзінства: вера, надзея і любоў. Дзякуючы якім я яшчэ жыву, людзей порчаных лячу. Бяроза мая паломніца. Сама яе садзіла да вайны яшчэ маленькай дзяўчынкай. Праз яе трымаю сувязь з продкамі, са сваёй бабуляй. Завязаныя стужкі на галінках - запаветныя мары людскія. І тут я зразумела, чаму Юля казала, што бабуля ў яе дзіўная. У хаце быў іншы уклад жыцця, пахі і прадметы нагадвалі музей, аднак не затхлы і, а хата жывая, цёплая, утульная. У кожным пакоі на покуці ў ільняных ручніках святыя. У галоўным пакоі на століку з крыжападобнымі ножкамі кнігі і Біблія, у драўлянай скрыначцы ружанцы крыжыкі, медальёны, лампадка над іконай, васковыя свечкі розных колераў састаўлены ў бабачнік. На драўляных лыжках і канапе саматканыя посцілкі. Пад нагамі вязаныя кручком дываны. І пах, з якім я, здаецца, нарадзілася, а пасля забылася, пах траў, натопленай печы, печанай бульбы. На кухні ніякага сучаснага посуду. Гліняныя гладышы, збаны, міскі, драўляныя лыжкі. Пад рукамыйнікам драўляны цэбар, за печчу дзяжа з цэльным зернем.

- Мыйце рукі ды снедаць сядайце, госцейкі чаканыя!

У дзверы пастукалі. Зайшла жанчына сярэдніх гадоў, павіталася. Бабуля запрасіла прысесці і выслухала. Па ўсім відаць хворую жанчыну, і суцешыла: “Ну залатнік, ён у чалавека ёсць. Тоўхае. А як толькі сарваўся – па ўсіх ужо месцах! І па грудзях, і ўнізу, і ў баку. Залатнік – як кулак па жывату ходзіць.” Праз прыадчыненыя дзверы ў вялікі пакой быў відаць на стале слоік з крынічнай вадой і вялікі жалезны крыж у ім. Чуўся шэпт і замовы “Залатнічок-панічок, саснуйся, сабярыся, каля пупа абхініся, абавіся каля пупа, як каля жалезнага слупа. Амінь.” За ўдзячнай жанчынай зачыніліся дзверы. Пытанне ў маіх вачах зразумела бабуля. Гэта ён крыж яшчэ адзін памочнік. Рэліквія наша сямейная ад бабулі маёй дасталася. А ёй яўрэйская сям’я падарыла, якую яны ад карнікаў схавалі. Далі з наказам: “Няхай, Юзэфка, уратуе крыж цябе і тых, каму ты жадаеш збавення.” З таго часу з бабулінага наказу і Божага дару лячу людзей. Пакуль адчуваю, што патрэбна людзям, буду ратаваць, стужкі на бярозе завязваць. Не хацелася ад’язджаць з гэтага рукатворнага Эдэма, кропкі на геаграфічнай карце, а рай, дзе людзі ўсміхаюцца і не чуваць брыдкых слоў, дзе прыгажосць пачуццяў, душы, знешняга выгляду адно цэлае, не разарваная повязь часоў, традыцый, паняццяў. Усё суіснуе ў ладзе і згодзе па жаданні пана Бога.

Уражаная, мудрая і шчаслівая я вярнулася дадому. Пераступіла парог хаты:

- “Дзяньдобры, мамачка!”

- Што за дзіўнае прывітанне?

- Так у Эдэме гавораць, - усміхнулася я. Узяла рыдлёўку і ля веснічак пасадзіла прыгожую бярозку, завязала ружовую стужку са сваёй марай. Як вы думаеце якой?